Яўген Усошын

Сяргей Гаек

# Беларускі грэка-каталіцкі пакутнік

# Антон Неманцэвіч

# (1893–1943)

Полацк
Грэка-каталіцкая парафія
Святапакутніка Язафата ў г. Полацку
2023

pawet.net

УДК 272
ББК 86.377
У76

*Аўтар партрэта Ганна Цімашук*

**Усошын Я., Гаек С.**
У76 Беларускі грэка-каталіцкі пакутнік Антон Неманцэвіч (1893–1943) / Яўген Усошын, Сяргей Гаек. — Полацк, Грэка-каталіцкая парафія Святапакутніка Язафата ў г. Полацку, 2023. — 24 с.

ISBN 978-985-6448-52-5.

У 2023 годзе прыпадаюць дзве даты, звязаныя з жыццём беларускага грэка-каталіцкага апостальскага экзарха Антона Неманцэвіча (1893–1943). Гэта 130-годдзе яго нараджэння (8 лютага 1893 г. у Пецярбургу) і 80 год з моманту яго пакутніцкай смерці ў мінскай турме СД (6 студзеня 1943 года). Пакутніцкі шлях экзарха Антона пачаўся ў жніўні 1942 года, у пэрыяд генацыду беларускага народа часоў Вялікай Айчыннай вайны, калі ён быў арыштаваны нямецкімі нацыстамі. Некалькі тыдняў пазней, восенню 1942, гітлераўскія карныя аддзелы спалілі палескія вёскі (з іх жыхарамі), што ўваходзілі ў склад грэка-каталіцкай (нэа-унійнай) парафіі ў Бабровічах.

Кніга накіравана да шырокага кругу чытачоў.

**УДК 272**
**ББК 86.377**

**ISBN 978-985-6448-52-5**

© Усошын Я, Гаек С., тэкст, 2023
© Афармленне. Грэка-каталіцкая парафія Святапакутніка Язафата ў г. Полацку, 2023

## Прадмова

У 2023 годзе адзначаюцца дзве даты, звязаныя з адным з найбольш актыўных беларускіх уніяцкіх душпастыраў XX ст. — апостальскім экзархам Антонам Неманцэвічам (1893–1943). Гэта 130-годдзе яго нараджэння (8 лютага 1893 г. у Пецярбургу) і 80 год з моманту яго пакутніцкай смерці ў мінскай нацысцкай турме СД (6 студзеня 1943 года).

Служэнне а. Антона Неманцэвіча ў Беларусі пачалося ў пачатку восені 1929 года, калі ён прыехаў з Рыму ў Альбярцін на Слонімшчыну і ўключыўся ў дзейнасць Усходняй Місіі Езуітаў. У Альбярціне а. Антон пачаў выдаваць часопіс «Да Злучэньня». Першы нумар яго выйшаў у студзені 1932 года.

У верасні 1939 года Заходняя Беларусь знайшлася ў межах БССР. У новай сітуацыі, у 1940 годзе, а. Антон Неманцэвіч прымае прызначэнне на пасаду кіраўніка Беларускага грэка-каталіцкага экзархату. На гэтай пасадзе Папа Рымскі Пій XII пацвердзіў яго 22 лістапада 1941 г. як апостальскага адміністратара.

Экзарх Антон дзейнічаў вельмі рупліва, у пачатку 1942 года заснаваў Апостальства Малітвы за Беларусь. Раз у месяц святары і прыхаджане маліліся за сваю Бацькаўшчыну.

У той час распачаліся на Слонімшчыне расстрэлы каталіцкага духавенства. Пакутніцкі шлях экзарха Антона пачаўся ў жніўні 1942 года, калі ён быў арыштаваны нямецкімі нацыстамі. Нямецкія акупанты разумелі ранг пастыр-

скага служэння гэтага грэка-каталіцкая іерарха, таму пасля арышту перавязлі яго ў турму СД у Мінску. Некалькі тыдняў пазней, восенню 1942, гітлераўскія карныя аддзелы спалілі палескія вёскі (з іх жыхарамі), што ўваходзілі ў склад грэка-каталіцкай (нэа-унійнай) парафіі ў Бабровічах (сёння Івацэвіцкі раён).

Памяць аб руплівым духоўным служэнні экзарха Антона ды аб яго мужным пакутніцкім подзвігу верна захоўваецца сярод грэка-католікаў Беларусі. Яна асабліва жывая ў сэрцых вернікаў парафій і супольнасцей, што знаходзяцца на тэрыторыі служэння іерарха-пакутніка. У духу малітоўнай пашаны вернікі грэка-каталіцкай парафіі ў Івацэвічах рэгулярна наведваюць Альбярцін, Бабровічы ды іншыя памятныя месцы генацыду беларускага народа часоў Вялікай Айчаннай Вайны.

Дзеля ўмацавання памяці аб белаларускім пакутніку экзарху Антоне Неманцэвічу выдаецца гэтая брашура, у якой перадрукоўваецца навуковы артыкул беларускіх даследчыкаў Яўгена Усошына і Сяргея Гаека, змешчаны ў міжнародным штогодніку «Багаслоўскія летапісы» («Roczniki Teologiczne», Люблін, 2007-7). Захоўваецца мова арыгіналу.

*Протадыякан Вячаслаў Гарчакоў*
*Івацэвічы, 6 студзеня 2023 г.*

ROCZNIKI TEOLOGICZNE
Tom LIII–LIV, zeszyt 7 – 2006–2007

# ЭКЗАРХ АНТОН НЕМАНЦЭВІЧ — ВЕРНЫ СЬВЕДКА ЕВАНГЕЛЬЛЯ КОЛЬКІ СЛОЎ ПРА ЯГОНАЕ ДУХОЎНАЕ СЛУЖЭНЬНЕ

6 студзеня 1943 года ў шпіталі менскае турмы СД памёр Экзарх Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы (БГКЦ) айцец Антон Неманцэвіч (SJ)[1]. Ён належаў да выдатных беларускіх царкоўных дзеячоў XX-га стагодзьдзя, якія стараліся наладзіць братэрскія адносіны з праваслаўнымі. Значная частка ягонага жыцьця была зьвязаная з дзейнасьцю Ўсходняе Місіі Езуітаў у Альбярціне, якая чакае яшчэ поўнага, інтэр-дысцыплінарнага дасьледваньня вучоных, што шырока і непрадузята паказала б яе шматбаковы характар і ролю ў будаваньні прэ-экуменізму ў міжваенны час[2]. Та-

[1] *Переписка с окружными комиссариатами и служителями религиозного культа об идеологическом воспитании населения и по вопросам церкви*. Национальный Архив Республики Беларусь, ф. 370, оп. 1, д. 2, л. 5.

[2] Пар. зьмешчаны ў гэтым нумары RTKUL артыкул слонімска-менскага дасьледчыка Сяргея Ёрша: Siarhiej Jorsz. *Historyczne znaczenie Misji Wschodniej jezuitów w Albertynie*. Агульная панарама дзейнасьці Місіі зьмешчаная ў артыкуле: S. Stępień. *Nowa unia kościelna. Obrządek bizantyńsko-słowiański.* У: *Polska-Ukraina. 1000 lat sąsiedztwa.* T. 2. Przemyśl: Południowo-Wschodni Instytut Naukowy w Przemyślu, 1994, s. 141–193.

кое больш поўнае дасьледваньне паказала б постаць айца Антона Неманцэвіча як тэолага і душпастыра, які цярпліва і нястомна стараўся будаваць братэрскія адносіны з праваслаўнымі ў духу «пакорлівасьці і рэсьпекту для праваслаўнай Царквы», пра што ў той час «марыў» ягоны сабрат а. Філіп дэ Рэжыс (SJ)[3], які добра ведаў Альбярцінскую місію.

Гэты кароткі навуковы камунікат пра беларускага Экзарха аўтары маюць намер зьмясьціць упершыню на старонках навуковага часопісу «Roczniki Teologiczne», які выдаецца Экуменічным Інстытутам Люблінскага Каталіцкага Універсітэту (ЛКУ), паколькі гэты Універсітэт быў месцам, дзе ў 1928/29 гадах малады доктар усходняга багаслоўя а. Антон Неманцевіч пачынаў сваю выкладчыцкую працу[4].

---

[3] Глядзі: V. Poggi. *Le travail futur, d'après Philippe de Régis S. J.* (1897–1955). «Orientalia Christiana Periodica», 1992, vol. 58, nr 1, p. 5–21 (passim) ды C. Simon. *Russicum. Vol. 2: The First Years*: 1929–1939. Roma: Opere Religiose Russe 2002 (passim).

[4] L. Górka. *Geneza Sekcji Teologii Porównawczej i Ekumenicznej KUL. Szkic historyczny*. W: L. Górka, S. J. Koza. W *służbie jedności chrześcijan. Instytut Ekumeniczny KUL*, 1983–2000. Lublin: Wydawnictwo KUL, 2002, s. 27. [25–31].

## I. Мучаніцкі *подзьвіг*

Да нядаўняга часу ў беларускай і польскай гістарыяграфіі існавала некалькі розных версіяў адносна прычыны, даты і месца сьмерці Экзарха Неманцэвіча. 24 жніўня 2004 году навуковы рэферэнт Сакратарыяту Апостальскага Візітатара БГКЦ менскі гісторык Яўген Усошын адшукаў у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь новы каштоўны дакумент пра дату сьмерці і пахаваньня Экзарха Антона Неманцэвіча[5]. Пры пошуку дакументу вельмі дапамагла кніга гродзенскага дасьледчыка Э. С. Ярмусіка *Католический костел на Беларуси в годы второй мировой войны* (Гродно 2002).

Адшуканы дакумент пра сьмерць і паховіны Экзарха А. Неманцэвіча трапіў у фонд 370 дакументаў Генеральнага камісарыяту Беларусі, у архіўную справу *Перапіска з акружнымі камісарыятамі і служыцелямі рэлігійнага культу пра ідэалагічнае выхаваньне мясцовага насельніцтва і па пытаньнях царквы* (ф. 370, воп. 1, спр. 2, арк. 5). Дакумент выглядае наступным чынам: на ім прысутнічае рэгістрацыйны штамп канцылярыі Генеральнага камісарыяту з пазначанай на ім датай — 21 студзеня 1943 году. Дакумент падпісаны оберштурмбанфюрэрам СС без расшыфроўкі яго прозьвішча. Можна думаць, што подпіс на дакумэнце належыць Эдуадру Штраўху, бо менавіта ён быў камандзірам паліцыі бясьпекі і СД

---

5 [Я. Усошын]. *Новы дакумент пра лёс Экзарха Антона Неманцэвіча.* НА РБ, ф. 370, воп. 1, спр. 2, арк. 5.

у Менску ў гэты час. У згаданым дакуменце сьцвярджаецца: «З меркаваньняў паліцыі бясьпекі Неманцэвіч мусіў быць пераведзены са Слоніма ў Мінск. 30.11.1942 г. ён захварэў на сыпны тыф. [...] Зважаючы на значэньне ягонай асобы, ён быў дастаўлены ў штабкватэру паліцыі бясьпекі і СД Беларусі. Тут ён памер 6.01.1943 г. ад сардэчна-сасудыстай недастатковасьці, якая наступіла пасьля сыпнога тыфу»[6]. Але а. Антон хварэў на тыф яшчэ ў дзяцінстве і меў імунітэт на яго, таму можна згадзіцца з а. Львом Гарошкам, які лічыць, што нямецкія нацысты проста спрабавалі схаваць такім чынам забойства (сярод тартураў) а. Антона як выдатнага душпастыра і высокага царкоўнага ярарха. У любым выпадку можна гаварыць пра ягонае мучаніцтва *ex aerumnis carceris* (вычарпаньне ў варунках турмы).

[6] У цытаваным дакуменце чытаем: «Niemancewicz mußte aus sicherheitspolizeilichen Gründen von Slonim nach Minsk überführt werden. Am 30.11.42 erkrankte er an Fleckfieber. [...] wegen der Bedeutung seiner Person wurde er in das Revier des Kommandeurs der Sicherheitspolizei und des SD Weißruthenien gebracht. Hier verstarb er am 6.1.43 an Herz- und Kreislaufschwächeim-Anschluß an Fleckfiebererkrankung».

## II. Пакліканьне

Мучаніцкі подзьвіг беларускага Экзарха Антона Неманцэвіча быў вянцом і плёнам ягонай дзейснай веры ды руплівага пастырскага служэньня. Нарадзіўся ён далёка ад сваей радзімы — у сталіцы Расейскае імпэрыі Санкт-Пецярбургу 8 лютага 1893 года[7]. Ягоныя бацькі, Вікторыя і Ян, прыехалі туды з ваколіцаў Саколкі. Бацькі выхавалі яго добрым і ахвярным каталіком. Скончыўшы вядомую ў Пецярбургзе прыватную каталіцкую гімназію сьв. Кацярыны, малады юнак выбраў нялёгкую сьвятарскую дарогу. Пасьля заканчэньня ў 1915 годзе каталіцкай сэмінарыі ён адразу паступіў у мітрапалітальную Духоўную Акадэмію, якая ў той час існавала ў Пецярбургу.

У тым самым годзе ён становіцца сябрам беларускага кола ў гэтай акадэміі. Большасьць чальцоў гэтага знакамітага кола сталася пазьней шчырымі руплíўцамі магутнага руху беларускага каталіцкага адраджэньня пачатку XX стагодзьдзя. А ў 1915 годзе ў Акадэміі іх было дванаццаць, якія паглыблялі веды пра сваю Бацькаўшчыну і распаўсюджвалі іх сярод іншых. На адным з паседжаньняў гэтага клюба а. Антон Неманцэвіч зрабіў даклад пра Берасьцейскую Унію, да якой ужо тады меў вялікі інтарэс[8]. Акрамя таго, ён, цягам свайго побыту ў Пецярбургу, пашырае

[7] Пар. J. Garbiński. *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.* Warszawa, 2003, s. 276.

[8] Ю. Туронак. *Падрэзаныя крылы.* «Наша Вера», 2003, № 2, стар. 33.

ідэю еднасьці Цэркваў сярод мясцовых праваслаўных. Гэтую руплівасьць айца Неманцэвіча заўважыў і Экзарх расійскіх грэка-каталікаў а. Леанід Фёдараў (1879–1935). У сваім лісьце да мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага ён пісаў, што сярод беларускіх сьвятароў-лацінькікаў ёсьць шмат шчырых прыхільнікаў Уніі, якія дзеля гэтага нават гатовыя прыняць усходні абрад. Спаміж некалькіх пералічаных прозьвішчаў расейскі экзарх згадвае і айца Антона[9].

Але папрацаваць на карысьць Богу і еднасьці Цэркваў на Бацькаўшчыне сьвятару давялося толькі ў 1929 годзе, амаль праз дзесяць год пасьля напісаньня згаданага ліста. Перад гэтым а. Антон пасьпеў двойчы (у 1919 і 1921)[10] пабываць у савецкім астрозе за «занадта актыўную рэлігійную дзейнасьць». Быў ён сярод вязьняў, якімі абмянялася бальшавіцкая Расія з Польшчай, а пасьля па накіраваньню мітрапаліта Эдварда Ропа (1851–1939) выехаў на вучобу ў Рым ў Папскі Усходні Інстытут і вярнуўся ў Польшчу доктарам усходніх царкоўных навук, абараніўшы дысертацыю, прысьвечаную выхаваньню моладзі ў бальшавіцкай Расеі.

Увосень 1929-га, пасьля года выкладчыцкай працы ў Любліне ў Каталіцкім Унівэрсітэце і Місійным

---

[9] В. фон Бурман. Леонид Фёдоров. Жизнь и деятельность, http://www.krotov.info/history/20/tarabuk/burman04.html (22.05.2005).

[10] Por. G. Karolewicz. *Nauczyciele akademiccy Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego w okresie międzywojennym*. T. II. Lublin, 1994, s. 153.

Інстытуце, а. Антон вярнуўся на сваю Айчыну ў прыгарад Слоніма, Альбярцін, дзе паступіў у навіцыят айцоў езуітаў усходняга абраду. Будучы ўжо трыццацішасьцігадовым сьвятаром, з дастаткова багатым досьведам, два гады ён прабыў разам з маладымі калегамі ў навіцыяце, дзе вучыўся ў пакоры манаскаму жыцьцю і езуіцкай духоўнасьці.

## III. Да Злучэньня

Словы *Да Злучэньня* можна лічыць своеасаблівым дэвізам айца Антона Неманцэвіча. Менавіта гэтыя два словы беларускі сьвятар зрабіў назовам рэдагаванага ім рэлігійнага часопіса, які ён пачаў выпускаць з 1932 года ў Альбярціне. Ён быў сапраўдным рыцарам прымірэньня і аб'яднаньня Цэркваў, людзей, беларускага народу. Яму балела раз'яднанасьць Царквы Хрыстовае, а разам з царкоўнай і раз'яднанасьць народная. Гэтыя дзьве драмы, і царкоўны, і нацыянальны падзел, айцец Антон глыбока перажываў і заклікаў ад імя рэдакцыі заснаванага ім часопіса: «да злучэньня … ўсіх Беларусаў, сыноў, дачок аднае нашае Бацькаўшчыны, разьбітых на часткі ў найбольш чуткім мейсцы свае душы, у сазнаньні свае рэлігійнае прыналежнасьці»[11]. Айцец Антон ўважаў, што еднасьць грамадзкая наступіць у беларусаў, калі яны будуць адзінымі рэлігійна.

Але ён не імкнуўся прывесьці кагосьці да гэтае жаданае еднасьці праз фізічнае ці маральнае насільле, бо глыбока паважаў годнасьць чалавека, а значыць, свабоду ягонай волі, права выбару, вернасьць уласнаму сумленьню. Падставаю для еднасьці хрысьціянаў была для яго толькі супольная любоў[12].

[11] *Ад рэдакцыі.* «Да Злучэньня», 1932, № 1, стар. 2. Рэдакцыйны зварот першага нумару часопіса верагодна быў напісаны самім айцом Антоніем, пра што сьведчаць асаблівасьці пісьма і стылю.

[12] *Ад рэдакцыі.* «Да Злучэньня», 1932, № 1, стар. 2.

Гэта не былі словы, пушчаныя на ўзьвей вецер. У штодзённых адносінах айцец Антон ажыцьцяўляў гэтыя свае прынцыпы. Падцьвердзіць гэта можна хацяб тым фактам, што на пачатку вайны ён дапамагаў сьвятару праваслаўнага прыхода ў суседняй да Альбярціна вёсцы Чапялёва адпраўляць пахавальныя абрады ў тых мясцінах, куды не меў змогі даехаць той сьвятар. Не пакідаў ён і людзей, закінутых у цяжкія акалічнасьці жыцьця. Падчас першых месяцаў нямецкай акупацыі ён наведваў лягеры ваеннапалонных савецкіх салдатаў у ваколіцах Слоніма, нават тады, калі там лютавала эпідэмія тыфу, а ягоны таварыш у гэтых візітах айцец Ян Гермацюк, заразіўшыся, памёр.

Іншым, недасьледваным асьпектам духоўнага служэньня Альбярцінскай Місіі Езуітаў, у тым ліку і а. Антона Неманцэвіча, ёсьць дапамога, якую Місія несла перасьледаваным яўрэям[13].

---

[13] Інфармацыю пра слонімска-альбярцінскіх езуітаў і іхнюю дапамогу яўрэям глядзі на сайце: http://www.jezuici.pl/beatyfikacja/index1.htm: «ks. Sztark Adam [SJ], ur. 30.07.1907, wyśw. 24.06.1936, zm. 28.12.1942 w Słonimiu. Misjonarz ludowy w Pińsku, w październiku 1939 mianowany administratorem w Żyrowicach oraz kapelanem szpitalnym w Słonimiu. Gdy w czerwcu 1942 nastąpiło likwidowanie getta z narażeniem życia ratował Żydów. Aresztowany przez gestapo 18.12.1942, rozstrzelany razem z [słonimskimi] niepokalankami bł. Martą Wołowską oraz bł. Ewą Noiszewską. Uhonorowany przez Yad Vashem medalem „Sprawiedliwego wśród Narodów”».

## IV. «Служыць Богу, а не Ім паслугоўвацца»

Крытыкі унійнае акцыі абвінавачвалі яе то ў апалячваньні беларускага народу праз лацінізацыю (як некаторыя непрыяцелі нэа-уніі з праваслаўнага асяродзьдзя), то ў русіфікацыі беларускага народу (як некаторыя абаронцы польскасьці «крэсаў усходніх»). Адказам ім было сьцьвярджэньне а. Антона Неманцэвіча, што дзеля дасягненьня адной-адзінай іх мэты — злучэньня ў адно ўсіх хрысьціянаў — сьвятары «ўсходне-славянскага абраду выяўляюць сваю гатоўнасьць служыць толькі Богу і дзеля Бога»[14].

Айцец Антон зусім цураўся палітыкі. Ня знойдзем ніводнага ягонага выказваньня, якое можна было б трактаваць як палітычнае. У міжваенны час у Заходняй Беларусі шмат беларускіх сьвятароў актыўна ўдзельнічалі ў палітычнай дзейнасьці. Нават пасьля афіцыйнай забароны каталіцкім сьвятарам удзельнічаць у палітыцы, некаторыя з іх падтрымлівалі актыўныя кантакты з беларускімі палітычнымі дзеячамі. Айцец Антон не ангажаваўся ні ў якія палітычныя групоўкі[15].

---

[14] Злучэнец. *Наш адказ*. «Да Злучэньня» 1932 № 3, стар. 14.

[15] Таму цяжка прыняць гіпотэзы артыкула: С. Горбік, С. Ёрш. *Львоўская місія «Язафата»*, у якім уся *доказная база* грунтуецца на таямнічым дакуменце, знойдзеным у архіве *неназванага* беларускага эмігранта. Узьнікае пытаньне: калі аўтары пералічваюць усіх, у каго на руках пабываў дакумент, чаму не згадаць і апошняга ўладальніка? Гэта неабходная цаглінка ў вызначэньні аўтэнтычнасьці дакументу. Пазбаўленьне ананімнасьці яшчэ больш важнае, бо дакумент той — рукапісная копія! *Хто* яе зрабіў? *Хто* знайшоў дакумент — на жаль, не паведамляецца.

Ад справы свайго жыцьця — еднасьці Цэркваў — ён чакаў толькі добрых пладоў менавіта таго, што «цяперашняя Унія не мае на мэце якіхсьці карысьцяў палітычных, а толькі рэлігійныя — аб'яднаньне хрысьціян»[16]. Гэтае сьцьверджаньне вынікала са словаў, якія можна лічыць жыцьцёвым прынцыпам А. Неманцэвіча: «Наш абавязак адносна Бога — Яму служыць, а не Ім паслугоўвацца»[17].

Нават калі ён у сваім часопісе закранаў палітычную тэму, то ацэньваў яе з пункту погляду рэлігійнага і маральнага. Напрыклад, калі ён пісаў артыкулы пра *бязбожны камунізм*, то ганіў менавіта спробы зладзіць грамадзкае жыцьцё бяз Бога, зьнішчэньне Царквы Хрыстовай і масавае праліцьцё крыві бальшавікамі[18]. З другога боку, насьледуючы папу Пія XI, таксама ня мог не лічыць нацызм «неакелзаным расавым вар'яцтвам»[19].

Чужой для а. Антона была таксама нацыянальная абмежаванасьць. У першай палове дваццатых гадоў XX стагоддзя ён у маскоўскім касьцёле сьвятых Пятра і Паўла служыў польскай моладзі, якая ў тыя часы гуртавалася каля гэтага вогнішча рэлігійнасьці і за гэта быў арыштаваны бальшавікамі. У другой палове трыццатых гадоў ён выязджаў для працы на ўкраінскія парафіі на Валыні.

---

[16] а. Антоні. *Думкі аб Уніі.* «Да Злучэньня», 1932, № 6, стар. 11.

[17] Злучэнец. *Наш адказ.* «Да Злучэньня», 1932, № 3, стар. 14.

[18] Пар. Złučeniec. *My nia pomstujem, a papraŭlajem.* «Złučeńnie», 1938, nr 1, s. 14–16.

[19] Тамсама: пар. *Антыхрысьціянскі рух у Нямеччыне.* «Да Злучэньня», 1932, № 8–9.

Найбольш блізкай, аднак, была для яго праца для беларусаў і па-беларуску. Акрамя беларускамоўнага часопіса «Да злучэньня», які 1936 г. быў забаронены польскімі ўладамі, айцец Антон закладаў рэлігійныя гурткі для дзетак-беларусаў, праца ў якіх праходзіла па-беларуску. Ужо як Экзарх (на пасаду экзарха для беларускіх грэка-католікаў ён быў прызначаны мітрапалітам Андрэям Шаптыцкім 17 верасьня 1940 г.)[20] заснаваў «Апостальства малітвы за Беларусь».

Глыбокі аналіз народнага быту спарадзіў у а. Антона наступную горкую выснову: «Найбольшы наш вораг, браты Беларусы, мусім сказаць праўду, гэта адсутнасьць сьведамасьці народнай у саміх Беларусаў»[21]. Блытаньне рэлігіі з нацыянальнасьцю востра атакавалася на старонках «Да злучэньня»: «Хай жа Беларус ведае, што няма ані польскай, ані рускай

[20] Дакументы захованыя ў Львоускім архіве, гэта значыць перапіска паміж афіцыйнымі ватыканскімі установамі і экзархамі, а таксама, мітрапалітам Андрэям Шаптыцкім гавораць пра паўстанне 4 экзархатаў у 1939 годзе. Айцец Антон Неманцэвіч быў прызначаны на пасаду ў 1940 годзе ўвосень, якраз перад першым саборам экзархаў, 17 верасня. А сабор быў 18–19 верасня 1940 г. Менавіта таму ў дакументах сабораў ёсць толькі два даклады Экзарха Антона Неманцэвіча: на ІІ-гім 13–16 чэрвеня 1941 года і на ІІІ-цім саборы 9–15 чэрвеня 1942 года. Да 17.09.1940 года абавязкі экзарха для Беларусі выконваў Уладыка Мікалай Чарнецкі гл: *Док. № 143: Лист УГК Екзархів до секретаря Східної конгрегації Євгена Тіссерана про рішення розпочати унійну працю на території Радянського Союзу.* У: *Митрополит Андрей Шептицький. Церква і церковна єдність. Документи і матеріали.* 1899–1944. Т. І. Львів, 1995, стар. 357.

[21] Злучэнец. *Наш адказ.* «Да Злучэньня», 1932, № 11, стар. 13–15.

веры. Хай не мяшае народнасьці з рэлігіяй. Ці Беларус праваслаўны, ці каталік, ён заўсёды Беларус»[22]. Гэтыя словы паказваюць, што а. Антон стараўся быць душпастырам і сьведкам Евангельля для ўсіх сваіх суайчыньнікаў, незалежна ад веравызнаньня.

[22] *Ад рэдакцыі.* «Да Злучэньня», 1932, № 1, стар. 3.

## V. «Царква — наш вораг»

Асаблівае сьведчаньне вернасьці Евангельлю прыйшло Экзарху Антону скласьці падчас нямецкае акупацыі Беларусі. Ён актыўна працаваў тады як пастыр, пашыраючы навучаньне пра свой ідэал — зьяднаную Царкву. Айцец Леў Гарошка ў сваіх успамінах сведчыць, што айца Неманцэвіча неаднаразова папярэджвалі, каб быў ён больш абачлівы, бо ягоная актыўнасьць не падабаецца нямецкім акупацыйным уладам [23].

Ускосным доказам таго, што арышт «Экзарха грэка-уніяцкай Царквы у Беларусі» (*Exarch der griechisch-unierten Kirche in Weißruthenien*) у жніўні 1942 года быў спрычынены ягонай дзейнасьцю, як каталіцкага пастыра, зьяўляюцца словы шэфа менскага СД Эдварда Штраўха, якія ён сказаў 10 красавіка 1943 году, выгалошваючы даклад на нарадзе гэбітскамісараў і начальнікаў аддзелаў генеральнага камісарыяту акупацыйнай акругі Беларусь: «Без сумніву — Царква гэта наш вораг. Натуральна, Царква хоча папоўніць тут свае страты, якія яна зазнала ў Эўропе, а, асабліва ў Райху. Яна мела намер гэта зрабіць праз пранікненьне да праваслаўнае Царквы, акольным шляхам праз Уніяцкую Царкву (...). Умовы для яе былі спрыяльныя, і Рыма-каталіцкая Царква

[23] Пар. Л. Гарошка. *Айцец Антон Неманцэвіч.* «Божым шляхам», 1964, № 8 (паводле: Ю. Гарбінскі. *Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Жыцьцяпісы, мартыралогі, успаміны.* Мінск-Мюнхен, 1999, стар. 346–347).

прыйшла сюды зь вялікай колькасьцю прапаведнікаў і не сустрэла вялікіх цяжкасьцяў (...). Таму аднадушна мы вырашылі спыніць тут гэтую Рыма-каталіцкую Царкву (...). Паколькі большасьць духавенства прыняло бок палякаў, мне удалося іх злавіць і скончыць з імі»[24].

Добра бачна, што для нямецкіх нацысцкіх акупантаў Беларусі душпастырская руплівасьць каталіцкіх сьвятароў абодвух абрадаў, а можа нават у асаблівы спосаб сьвятароў грэка-каталіцкіх (грэка-уніяцкіх), зьяўлялася небясьпечнай. Таму лічылі яны Царкву сваім ворагам. Пакорлівы і руплівы сьведка Евангельля Экзарх Антон Неманцэвіч стаў «пагрозай» для магутнай, антычалавечай нацысцкай сыстэмы.

* * *

Айцец Антон Неманцэвіч, Экзарх Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы ва ўсім сваім жыцьці і служэньні стараўся быць пастырам і сьведкам Евангельля для ўсіх сваіх суайчынікаў, бяз розьніцы веравызнаньня ці палітычных поглядаў. Ягоным вялікім ідэалам была зьяднаная Царква. Як тэолаг і душпастыр цярпліва і нястомна стараўся ён будаваць братэрскія адносіны з праваслаўнымі ў духу «пакорлівасьці і рэсьпекту для праваслаўнай Царквы». Замучаны ў менскай турме СД быў пахаваны 9.01.1943 г. на нямецкіх могілках у Менску сьвятаром мясцовай праваслаўнай Царквы.

---

[24] Э. Ярмусик. *Католический костёл на Беларуси в годы второй мировой войны*. Гродно, 2002, стар. 227–228.

# БІБЛІЯГРАФІЯ


Архівальныя дакументы:

Док. № 143: Лист УГК Екзархів до секретаря Східної конгрегації Євгена Тіссерана про рішення розпочати унійну працю на території Радянського Союзу. У: Митрополит Андрей Шептицький. Церква і церковна єдність. Документи і матеріали. 1899–1944. Том. I. Львів, 1995, стар. 357.

Переписка с окружными комиссариатами и служителями религиозного культа об идеологическом воспитании населения и по вопросам церкви. Национальный Архив Республики Беларусь, ф. 370, оп. 1, д. 2, л. 5.

Артыкулы А. Неманцэвіча:

Ад рэдакцыі. «Да Злучэньня», 1932, № 1, стар. 2–3.

Антыхрысьціянскі рух у Нямеччыне. «Да Злучэньня», 1932, № 8–9.

а. А н т о н і: Думкі аб Уніі. «Да Злучэньня», 1932, № 6, стар. 11–12.

З л у ч э н е ц: Наш адказ. «Да Злучэньня», 1932, № 3, стар. 13–15.

Z ł u č e n i e c: My nia pomstujem, a papraŭlajem. «Złučeńnie», 1938, nr 1.

Апрацаваньні:

Г а р б і н с к і Ю.: Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Жыццяпісы, мартыралогі, успаміны. Мінск-Мюнхен 1999.

Г а р о ш к а Л.: Айцец Антон Неманцэвіч. «Божым шляхам», 1964, № 8.

Митрополит Андрей Шептицький. Церква і церковна єдність. Документи і матеріали. 1899–1944. Том. I. Львів, 1995.

Т у р о н а к  Ю.: Падрэзаныя крылы. «Наша Вера», 2003, № 2, стар. 30–35.

Я р м у с и к  Э.: Католический костёл на Беларуси в годы второй мировой войны. Гродно, 2002.

G a r b i ń s k i  J.: Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Warszawa, 2003.

G ó r k a  L.: Geneza Sekcji Teologii Porównawczej i Ekumenicznej KUL. Szkic historyczny. W: L. Górka, S. J. Koza. W służbie jedności chrześcijan. Instytut Ekumeniczny KUL, 1983–2000. Lublin: Wydawnictwo KUL, 2002, s. 25–31.

J o r s z  S.: Historyczne znaczenie Misji Wschodniej jezuitów w Albertynie. [Zob. w bieżącym numerze RT KUL].

K a r o l e w i c z  G.: Nauczyciele akademiccy Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego w okresie międzywojennym. T. II. Lublin, 1994.

P o g g i  V.: Le travail futur, d'après Philippe de Régis S. J. (1897–1955). «Orientalia Christiana Periodica», 1992, vol. 58, nr 1, p. 5–21 (passim) ды

S i m o n  C.: Russicum. Vol. 2: The First Years: 1929–1939. Roma: Opere Religiose Russe, 2002.

S t ę p i e ń  S.: Nowa unia kościelna. Obrządek bizantyńsko-słowiański. W: Polska-Ukraina. 1000 lat sąsiedztwa. T. 2. Przemyśl: Południowo-Wschodni Instytut Naukowy w Przemyślu, 1994, s. 141–193.

ЗМЕСТ

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

ЭКЗАРХ АНТОН НЕМАНЦЭВІЧ —
ВЕРНЫ СЬВЕДКА ЕВАНГЕЛЬЛЯ
КОЛЬКІ СЛОЎ ПРА ЯГОНАЕ ДУХОЎНАЕ СЛУЖЭНЬНЕ

I. Мучаніцкі подзьвіг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
II. Пакліканьне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
III. Да Злучэньня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
IV. «Служыць Богу, а не Ім паслугоўвацца» . . . . . . . 14
V. «Царква — наш вораг» . . . . . . . . . . . . . . . . 18

Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21

Навуковае выданне

**Усошын** Яўген
**Гаек** Сяргей

**Беларускі грэка-каталіцкі пакутнік**
**Антон Неманцэвіч (1893–1943)**

Адказны за выпуск а. Алесь Шаўцоў
Рэдактар Яўген Андросік
Камп'ютарны дызайн, вёрстка, дызайн вокладкі Юліі Глоба

Падпісана да друку 27.04.2023. Фармат 60x84x $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 1,6. Улік.-выд. арк. 0,5.
Наклад ??? асоб. Заказ ???.

Выдавец:
Грэка-каталіцкая парафія Святапакутніка Язафата ў г. Полацку.
Свидетельство № 1/344 от 05.06.2014.
Рэспубліка Беларусь, 211410, г. Полацк, вул. Навасёлаў, 70.

Паліграфічнае выкананне: